*13.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 52.
*14.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 68.
*15.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 117.
*16.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 118.
*17.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 256.
*18.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 257.
*19.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 342.
*20.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 429.
*21.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 431.
*22.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 506.
*23.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 507.
*24.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 580.
*25.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 581.
*26.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 582.
*27.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 662.
*28.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 694.
*29.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 745.
*30.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 788.
*31.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 855.
*32.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 882.
*33.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1048.
*34.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1068.
*35.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1153.
*36.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, т. 1, спр. 53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ДАСЯГНЕННЯЎ АЙЧЫННАЙ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ШКОЛЫ

***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры Бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Адной з формаў кансалідацыі навукоўцаў для вырашэння тэарэтыка-метадалагічных і прыкладных навуковых праблем з’яўляецца стварэнне навуковых школ. Функцыянальны патэн-

цыял навуковых школ вельмі значны: ён дазваляе не толькі ставіць і вырашаць актуальныя навуковыя задачы ў адзінстве канцэптуальных падыходаў, але і выступае важкім механізмам трансляцыі нормаў і каштоўнасцей навуковай дзейнасці, жыватворным асяроддзем для падрыхтоўкі і выхавання маладых даследчыкаў, забяспечвае высокі аўтарытэт і спрыяе фарміраванню іміджу навуковай, навучальнай установы.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (БДУКМ) на сённяшні дзень склаліся і развіваюцца ўнікальныя школы па шэрагу гуманітарных навук, якія атрымалі нацыянальнае і міжнароднае прызнанне і выконваюць значную ролю ў развіцці айчыннай навукі, адукацыі і культуры [13]. Адна з такіх навуковых школ – навуковая школа ў галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства».

У апошнія гады ў расійскім і ўкраінскім прафесійным друку з’явілася шмат публікацый, прысвечаных навуковым школам у бібліятэчна-інфармацыйнай навуцы [4; 5; 9; 10 і інш.], ідзе інтэнсіўная распрацоўка тэарэтычных праблем фарміравання навуковых школ у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, вылучаюцца два асноўныя цэнтры па распрацоўцы праблем іх фарміравання і развіцця, адзін – у Санкт-Пецярбургу (СПбДІКМ), другі – у Новасібірску (ГПНТБ СО РАН), абгрунтоўваецца палажэнне аб «сфарміраванай навуковай школе па вывучэнні навуковых школ у бібліятэчна-інфармацыйнай навуцы» [4, с. 23].

На распрацаваным тэарэтычным грунце паспрабуем прааналізаваць набыткі беларускай навуковай школы.

У працах аўтарытэтнага даследчыка Т. В. Захарчук навуковая школа вызначаецца як нефармальнае і/або фармальнае навуковае аб’яднанне вучоных некалькіх пакаленняў, характэрныя прыкметы якога: наяўнасць вучонага-лідара – заснавальніка навуковага напрамку (праграмы), яго вучняў (не менш двух пакаленняў, звычайна кандыдатаў навук) – паслядоўнікаў, прыхільнікаў; устойлівыя традыцыі ў сфарміраваным навуковым калектыве; фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні, падрыхтаваныя і абароненыя доктарскія і кандыдацкія дысертацыі; апублікаваныя манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя распрацоўкі, навуковыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артыкулы; згуртаванасць даследчыкаў, занятых вырашэннем значнай навуковай праблемы; самаідэнтыфікацыя членаў навуковай школы; прызнанне навуковай школы навуковай супольнасцю краіны ці рэгіёна, што, як правіла, адлюстроўваецца ў публікацыях, прысвечаных лідару школы ці яе вучням [4; 5].

Гэтыя якасці характэрныя і для беларускай навуковай школы ў галіне педагогікі па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве.

Годам заснавання навуковай школы лічыцца 1994-ы. Стымулам для яе ўтварэння і самаідэнтыфікацыі стала адкрыццё ва ўніверсітэце ў 1993 г. аспірантуры па спецыяльнасці 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, у 1996 г. – магістратуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», а крыху пазней і дактарантуры па гэтай жа спецыяльнасці. У тым жа 1996 г. створаны спецыялізаваны савет па абароне дысертацый па спецыяльнасці 05.25.03, які пэўны час меў статус доктарскага савета.

Адметнасць беларускай навуковай школы ў галіне разгляданых навук – гэта яе развіццё ў межах вышэйшай навучальнай установы; вызначэнне назвы школы па напрамку навуковай спецыяльнасці і як вынік – шырыня праблематыкі навуковых даследаванняў: пытанні гісторыі, тэорыі, методыкі, арганізацыі бібліятэчнай справы, бібліяграфіі, кніжнай культуры з вылучэннем у іх педагагічнага кампаненту, звязанага з выкарыстаннем кнігі, інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў у развіцці асобы, выхаванні, навучанні; заснаванне яе на базе трох спецыяльных кафедр факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый і ўваходжанне ў інтэлектуальнае ядро навуковай школы выкладчыкаў і выпускнікоў адзінай у краіне навучальнай установы вышэйшай адукацыі, якая рыхтуе спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйнай сферы; спрыяльныя ўмовы для педагагічных і навуковых камунікацый паміж заснавальнікам школы і яго вучнямі – паслядоўнікамі – для супольнай работы над навуковымі праектамі. Сярод сацыяльна-эканамічных, рэгіянальных асаблівасцяў і арганізацыйных умоў станаўлення беларускай навуковай школы трэба адзначыць грунтоўны фундамент і магчымасці выкарыстання дасягненняў папярэдніх пакаленняў навукоўцаў і выкладчыкаў бібліятэчнага факуль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэта (факультэт быў заснаваны ў 1944 г.); падтрымку і непасрэдны ўплыў на развіццё айчыннай школы навукоўцаў маскоўскай і ленінградскай навуковых школ у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства праз падрыхтоўку навуковых кадраў для Беларусі; адносна малады ўзрост навуковай школы, што, бясспрэчна, адбіваецца на сфарміраванасці «ланцужкоў» навуковых пакаленняў у межах школы.

Заснавальнік беларускай навуковай школы па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве – Васілій Емяльянавіч Лявончыкаў, доктар педагагічных навук, прафесар, правадзейны член Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (з 2018 г. – на заслужаным адпачынку) [2; 6; 8].

Навуковая школа, як навуковая супольнасць, аб'ядноўвае спецыялістаў, звязаных найперш распрацоўкай агульных навуковых праблем. У спецыяльным друку змястоўнае поле даследаванняў, у тым ліку адносна функцыянавання навуковай школы, ужо разглядалася як пры яе агульнай характарыстыцы [14], так і пры раскрыцці пытанняў вывучэння кнігазнаўства [7], чытання [1], навуковай дзейнасці асобных структурных падраздзяленняў універсітэта [3]. Адным з найважнейшых навуковых кірункаў у межах разгляданай школы з'яўляюцца праблемы бібліяграфазнаўства.

Вылучэнне беларускага бібліяграфазнаўства як навуковага накірунку даследаванняў у адзінстве праблематыкі, метадаў даследавання, выкарыстання іх вынікаў для аптымізацыі практыкі падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў і бібліяграфічнай практыкі работы бібліятэк адпавядала як грамадскай запатрабаванасці, так і зместу навуковых інтарэсаў, канцэптуальным асновам, распрацаваным лідарам школы В. Е. Лявончыкавым. Пачаўшы навуковую дзейнасць у галіне бібліяграфазнаўства ў пачатку так званага некласічнага перыяду развіцця гэтай дысцыпліны, Васіль Емяльянавіч актыўна даследаваў гістарычныя, тэарэтычныя і арганізацыйныя пытанні бібліяграфіі, спецыфіку іх праяўлення ў рэспубліканскай (часоў БССР) сістэме бібліяграфічнай дзейнасці. Неацэнны ўклад навукоўца ў гісторыю айчыннай бібліяграфіі. В. Е. Лявончыкаў вызначыў і руплівa

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаваў змястоўна-прадметнае напаўненне іншых дысцыплін беларускага бібліяграфазнаўства, далучыў да гэтай справы маладых навукоўцаў, увёў у навучальны працэс «Беларускую бібліяграфію» як вучэбную дысцыпліну для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Высокую адзнаку атрымалі доктарская дысертацыя па тэме «Система библиографической информации союзной республики: теоретико-методологические проблемы», абароненая ў спецыялізаваным савеце пры Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна (Масква, 1988 г.) і манаграфія «Система библиографической информации союзной республики: история, современное состояние, проблемы (Минск, 1990 г.). Прыхільнік інфармацыйна-дакументаграфічнай канцэпцыі А. П. Коршунава, які падняў прафесійную свядомасць спецыялістаў бібліяграфіі на новы ўзровень, В. Я. Лявончыкаў выявіў рэгіянальныя супярэчнасці ў сістэме дакумент – спажывец інфармацыі, абгрунтаваў прынцып дыферэнцыяцыі інфармацыйных патрэб рэгіёна на агульныя і спецыфічныя, што дазволіла ўдакладніць іх структуру, даследаваць сутнасць паняццяў «інфармацыйныя патрэбы рэгіёна» і «рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбы», раскрыць механізмы ўзнікнення і развіцця рэгіянальнай бібліяграфічнай інфармацыі.

Узбагачалі беларускае бібліяграфазнаўства навуковыя адкрыцці, зробленыя падчас падрыхтоўкі кандыдацкіх дысертацый не толькі пад кіраўніцтвам В. Е. Лявончыкава, але і кандыдатамі навук, якія закончылі аспірантуры Маскоўскага і Ленінградскага інстытутаў культуры. Іх дысертацыйныя працы прысвечаны развіццю асобных відаў беларускай бібліяграфіі і аптымізацыі сістэм бібліяграфічнай інфармацыі: рэкамендацыйнай (В. І. Саітава), літаратурнай (Т. М. Сакалова); бібліяграфічнага забеспячэння асобных сфер дзейнасці і катэгорый спецыялістаў (В. А. Касап, С. В. Зыгмантовіч), бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў (М. А. Яцэвіч).

Глыбокая трансфармацыя бібліяграфічнай дзейнасці, якая пачалася ў першай палове 1990-х гг., выкліканая дасягненнямі дзяржаўнага суверэнітэту і пачаткам дзіджыталізацыі, суправаджалася пераарыентацыяй айчыннага бібліяграфазнаўства на праблемы фарміравання нацыянальнай бібліяграфічнай сістэмы, якая б эфектыўна спрыяла бібліяграфічнаму забеспячэнню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсіх грамадскіх сфер, рэалізацыі паспяховых стратэгій доступу да лічбавага бібліяграфічнага кантэнту, а таксама прадстаўніцтву ў сусветнай інфармацыйнай прасторы. Пад кіраўніцтвам В. Е. Лявончыкава, С. В. Зыгмантовіч, В. А. Касап, М. А. Яцэвіча, Н. А. Ляйко гэтыя навуковыя задачы паспяхова выраша- ліся ў кандыдацкіх дысертацыях, прысвечаных бібліяграфіі па гісторыі Беларусі (Т. В. Кузьмініч), краязнаўчай (А. В. Прадзеіна), па мастацтве (І. У. Дрыга), літаратурнай і літаратуразнаўчай (Ж. Л. Раманава), біябібліяграфіі (А. Ю. Казленка), у навуковых работах замежных аспірантаў.

Неабходна адзначыць, што адным з важных навуковых дасягненняў айчыннай школы (В. Е. Лявончыкаў, Л. І. Доўнар, В. А. Касап, Т. В. Кузьмініч) стала абгрунтаванне на сучасных навуковых падмурках паняццяў «нацыянальны дакумент» і «беларускі друк» як аб'ектаў бібліяграфавання, вызначэнне нацыянальнай бібліяграфіі як віда і асаблівасцей яе функцыянавання ў краіне. Паспяхова вялося даследаванне галіновых бібліяграфічных сістэм.

У постнекласічны перыяд бібліяграфічнай навукі беларускае бібліяграфазнаўства не толькі ўспрымае тэарэтычную палікан- цэптуальнасць і сучасны метадалагічны арсенал, але і ўключаецца ў навуковае асэнсаванне пытанняў трансферу фіксаваных ведаў у лічбавым асяроддзі. Фундаментальныя змены ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства і лічбавыя тэхналогіі пачалі імкліва змяняць практыкі стварэння, захавання, распаўсюджвання і доступу да інфармацыйных аб'ектаў, раскрываючы новыя магчымасці для развіцця інтэграцыйных працэсаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці і навукі з роднаснымі і іншымі сацыяльнымі практыкамі і даследаваннямі. Гэтыя працэсы разам з вышэйзгаданымі арганізацыйнымі падзеямі таксама паўплывалі на фарміраванне нацыянальнай навуковай школы. Міждысцыплінарнасць навуковых даследаванняў становіцца адной з характэрных рыс даследаванняў навукова-педагагічнай школы. Яшчэ адна асаблівасць – паглыбленне інтэграванасці з педагагічнай навукай, што абумоўлена не толькі актуальнасцю вывучэння праблем бібліятэк як сацыякультурных, адукацыйных цэнтраў, але і нарматыўнай замацаванасцю функцыянавання аспірантуры і магчымасцямі абароны кандыдацкіх дысертацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковыя даследаванні і практыка-арыентаваныя навуковыя распрацоўкі ў 2000-я гады вызначаюцца разнастайнасцю інфармацыйнага аспекту сацыякультурнай рэальнасці: праблемы нацыянальнага дакумента і кніжнай культуры, нацыянальнай бібліяграфіі, інфармацыйнай культуры, маркетынгавых камунікацый бібліятэк, прафесійных кампетэнцый бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў і інш. Завостранасць навуковых даследаванняў на новых актуальных тэмах вонкава зменшыла ўвагу да чыста бібліяграфазнаўчых пытанняў, – такая тэндэнцыя адзначаецца ў постсавецкіх і замежных краінах. У межах навуковай школы прасочваецца комплекснасць тэм даследаванняў – бібліяграфазнаўчы змест арганічна ўключаецца ў актуальную праблематыку сацыяльна-інфармацыйнага ўзаемадзеяння ў асноўных сферах функцыянавання бібліяграфічнай інфармацыі ў беларускім грамадстве. Адна з ключавых праблем – фарміраванне інфармацыйнай культуры і яе складовай часткі – бібліяграфічнай культуры ў кандыдацкіх дысертацыях Н. Ю. Вайцэховіч, А. Э. Паліцэвіч, В. А. Любчанка даследавана ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута з пазіцый сучасных бібліяграфічных пошукавых сістэм, сэрвісаў і тэхналогій.

Абагульняючы сучасныя напрамкі навуковых даследаванняў, якія праводзяцца ў рамках навуковай школы, можна вызначыць гісторыю беларускай бібліяграфіі, сістэму бібліяграфічнай інфраструктуры сучаснага інфармацыйнага грамадства краіны, інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы Беларусі і іх кадравы патэнцыял, тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці, праблемы інфармацыйнай культуры [11].

Акрамя змястоўнай трансфармацыі праблематыкі ў галіне бібліяграфазнаўства дасягненнямі навуковай школы можна назваць:

– пашырэнне маштабаў і вынікі даследчыцкай дзейнасці, што знаходзяць сваё адлюстраванне ў публікацыйнай актыўнасці выкладчыкаў, аспірантаў і падрыхтоўцы шэрагу фундаментальных навуковых прац (манаграфій, тэматычных зборнікаў), вучэбных дапаможнікаў па дысцыплінах бібліяграфазнаўчага цыклу з грыфам міністэрства адукацыі, ВМА па адукацыі ў галіне культуры і мастацтва [12];

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пашырэнне кола навуковых кіраўнікоў даследаваннямі дысертантаў, што сведчыць пра якасны рост выкладчыкаў спецыяльных кафедр і фарміраванні іерархічных «ланцужкоў» навуковых пакаленняў у межах школы;

– сувязь навуковай школы з вырашэннем праблем забеспячэння навучальна-прафесійнай дзейнасці, што ўплывае на прадметна-змястоўны профіль і вынікі;

– падрыхтоўку аспірантаў на аснове мэтавага набору (кантрактнай сістэмы) і забеспячэнне кіраўніцтва практыка-арыентаванымі тэмамі па заяўках бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;

– паспяховае ўключэнне выкладчыкаў кафедры ў правядзенне навуковых даследаванняў па заяўках на навукова-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання ў сферы культуры;

– актывізацыю экспертнай дзейнасці членаў навуковай школы.

Вызначаныя некаторыя асаблівасці беларускай навуковай школы ў галіне педагогікі па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве, у тым ліку на прыкладзе развіцця беларускага бібліяграфазнаўства, сведчаць, што дадзеная тэма можа і павінна выступаць у якасці самастойнага больш грунтоўнага даследавання ў розных кантэкстах: гістарычным, сацыяльным, персанаграфічным, псіхолага-педагагічным, камунікацыйным, змястоўным і інш. Цікавасць да навуковых школ і асэнсаванне іх дзейнасці – прадуктыўны шлях для найбольш канструктыўнага вырашэння навуковых задач дзеля развіцця як бібліятэчна-інфармацыйнай галіны, так і вырашэння пытанняў, звязаных з неабходнасцю ідэнтыфікацыі навуковай школы з новымі лідарамі, павышэння аўтарытэту, папулярызацыі яе дасягненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Авгуль, Л. А.* О вкладе ученых-преподавателей Белорусского государственного университета культуры и искусств в изучение чтения / Л. А. Авгуль // Библиотеки и музеи в современной образовательной и социокультурной среде : сохранение традиций и перспективы развития : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвященной 75-летию факта информационно-документных коммуникаций Белорусского государственного университета культуры и искусств (Минск, 24–26 сент.

2019 г.) : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2019. – Ч. 1. – С. 25–31. – Библиогр. : 15 назв.

2. *Вайцехович, Н. Ю.* Первый среди равных : на академическом Олимпе Беларуси ; [рец. на кн.: Василий Емельянович Леончиков : библиографический указатель / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, биб-ка ; сост.: Т. В. Ишутина, Т. А. Самойлюк ; вступ. ст. В. А. Касап, В. И. Саитова. – Минск : БГУКИ, 2012. – 71 с.] / Н. Ю. Вайцехович // Мир библиографии. – 2014. – № 5. – С. 67–69.

3. *Дзямешка, Л. А.* Гісторыя кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ў кантэксце рэалізацыі навукова-даследчай функцыі / Л. А. Дзямешка, С. В. Зыгмантовіч // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці : матэрыялы навук.-практ. канф. (Мінск, 21–22 кастр. 2009 г.). – Мінск, 2010. – С. 185–190. – Бібліягр. : с. 189–190 (3 назвы).

4. *Захарчук, Т. В.* Еще раз о научной школе в библиотечно-информационной науке / Т. В. Захарчук // Библиосфера. – 2015. – № 2. – С. 125–127.

5. *Захарчук, Т. В.* Научная школа в библиографоведении: теоретико-методологический аспект : автореф. дис. … д-ра пед. наук / Т. В. Захарчук. – СПб., 2013. – 43 с.

6. *Касап, В. А.* Лявончыкаву Васілю Емяльянавічу – 75 : [прафесар БДУКМ] / В. А. Касап, В. І. Саітава // Бібліятэчны свет. – 2012. – № 3. – С. 33.

7. *Касап, В. А.* Кнігазнаўчыя даследаванні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў / В. А. Касап // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. − 2008. – С. 119–123.

8. *Касап, В. А.* Ученый, педагог, организатор подготовки библиотечных кадров / В. А. Касап, В. И. Саитова // Библиография. – 2012. – № 3. – С. 125–127.

9. *Кушнаренко, Н. Н.* Научные школы книговедческого и библиотечно-информационного профиля : признаки идентификации / Н. Н. Кушнаренко, А. А. Соляник // Научные и технические библиотеки. – 2011. – № 12. – С. 45–54.

10. *Макеева, О. К.* Научные школы в области библиотековедения, библиографоведения и книговедения : к изучению вопроса / О. К. Макеева // Библиотековедение. – 2014. – № 3. – С. 23–29.

*11.* Научная школа в области педагогики «Библиотековедение, библиографоведение и книговедение». – Минск : БГУКИ, 2014. – 110 с.

*12.* Труды преподавателей факультета информационно-документных коммуникаций Белорусского государственного университета культуры и искусств (2005–2018) : библиогр. указатель / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; сост.: Ю. Г. Лазакович, Т. А. Фролова. – Минск : БГУКИ, 2019. – 377 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13. Языкович, В. Р.* Актуальные тенденции научных исследований в Белорусском государственном университете культуры и искусств / В. Р. Языкович // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2017. – № 1 (27). – С. 5–8.

*14. Яцэвіч, М. А.* Навукова-педагагічная школа ў галіне бібліятэка-знаўства, бібліяграфазнаўства : (да 20-годдзя стварэння) / М. А. Яцэвіч, В. А. Касап // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2015. – № 2 (24). – С. 157–164.

# МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПОСТУЛАТЫ СОЦИОЛОГИИ КУЛЬТУРЫ КАК ОТРАСЛИ ЗНАНИЯ И УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ

***П. Г. Игнатович,***
*кандидат исторических наук, профессор,*
*профессор кафедры философии и методологии гуманитарных наук*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Социология культуры принадлежит к числу довольно молодых гуманитарных наук. В ней много непроясненного, неоднозначного, требующего уточнения и конкретизации. Ее нельзя считать дисциплиной со стабильным предметом, концептуальным аппаратом и методологией. Специалисты в области культуры до сегодняшнего дня спорят о том, что собой представляет ее предмет, в чем принципиальное отличие социологии культуры, скажем, от философии культуры, какова система ее базовых понятий, как отграничить предметное поле социологии культуры от других наук, изучающих феномен культуры, от других специальных и отраслевых социологических теорий, в том числе изучающих отдельные направления культуры (социология науки, социология искусства, социология религии и т. д.). Постулат (лат. postulatum – требование) – принцип, положение, которое служит основанием для осуществления содержательных рассуждений и выводов [2, с. 646].

Различия между подходами к определению социологии культуры во многом обусловлены разным пониманием того, что представляет собой собственно культура. Культура является одним из важнейших факторов развития человека и общества. Она возникает в результате деятельности людей и в силу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ